ку 1948 г. тут вучылася 96 хлопчыкаў і дзяўчынак. Потым з кожным годам іх станавілася ўсё менш і менш. І калі ў 1982 г. іх колькасць дайшла да 6 вучняў ва ўсіх класах, школу закрылі. Цяпер дзеці ходзяць вучыцца ў Бярозаўку. А ў будынку Ляцягаўскай школы жывуць нашы аднавяскоўцы.

У вёсцы была царква. Яе пабудавалі каля 150 гадоў таму са смалістых бярвён, абабілі шалёўкай і пафарбавалі ў яркі колер. У час антырэлігійнай кампаніі богаслужэнне тут спынілася. Абразы забралі мясцовыя жыхары, а сам будынак быў ператвораны ў клуб.

У час вайны, калі ў 1943 г. тут спыніўся фронт, гітлераўцы стаялі на правым беразе Проні, а нашы — на левым. Купал царквы служыў немцам добрым арыенцірам, і яны вялі па вёсцы артылерыйскі агонь. У час падрыхтоўкі наступлення войскаў Чырвонай Арміі ў Ляцягах было сканцэнтравана шмат вайскоўцаў. Каб пазбегнуць вялікіх ахвяр, было загадана разбурыць царкву.

Пасля вайны вёска адрадзілася. Быў пабудаваны новы клуб з кінастацыянарам. Прыйшло ў Ляцягі і святло. Вёска ажыла. Але ў апошнія гады ўсё стала мяняцца. Ляцягі пусцеюць. Нараджальнасць складае 1—2 чалавекі ў год і то не ў кожны. Не хапае працаўнікоў для калгаснай вытворчасці. Застаюцца адны састарэлыя. Многія двары апусцелі, зараслі бур'янам. І яны наводзяць нейкую жудасць. Можа і тут Чарнобыль? Праўда, нядаўна пабудаваны новы магазін. Толькі ў ім часта мяняюцца прадаўцы. Сваіх няма, а чужыя не прыжываюцца.

Што добра — па цэнтры вёскі пракладзена асфальтавая дарога. Чатыры разы на дзень ходзіць аўтобус з Ляцягаў у Слаўгарад і назад. Там-сям пастаўлены вадаправодныя калонкі. Але ж работнікаў — лічаныя адзінкі. Яны выконваюць усю працу на ферме, у полі. Ім дапамагаюць пенсіянеры. Людзі нашы працавітыя. Не пакінуць фермы і палі. Збіраюцца часам жыхары і кажуць:

— Што будзе далей? Можа здарыцца тое, што з вёскай Трасліўкай. Яе ўжо на карце няма, і, кажуць, дарога туды мурагом зарасла, а дрэўцы і садкі калгас бульдозерам згарнуў. Загубленае жыццё. Хто кажа, што Бог дасць, то і будзе. Не, трэба думаць сёння пра далейшы лёс нашай вёскі і другіх ёй падобных.

*П.Е.Кавалькоў.*

## Вызначыліся працай

### ГЕРОІ, АРДЭНАНОСЦЫ

Слаўгарадчына здаўна славіцца таленавітымі і працавітымі людзьмі. Пра многіх з іх ужо гаварылася вышэй. А зараз наша цёплае слова аб тых, хто ў пасляваенны час памнажае славу і гонар старэйшых пакаленняў і за сваю плённую працу адзначаны ўрадавымі ўзнагародамі, ганаровымі званнямі, граматамі, прэміямі.



М.В.Атрохаў.



М.П.Бяганскі.

**АТРОХАЎ Міхаіл Варфаламеевіч.** Нарадзіўся ў 1928 г. у в. Закрупец Слаўгарадскага раёна. З дзіцячых гадоў працаваў у мясцовым калгасе, у 1948 г. па пуцёўцы камсамола накіраваны ў каменнавугальную прамысловасць. Працаваў у забоі, потым намеснікам начальніка ўчастка № 6 шахты № 1 цэнтральнага трэста «Чырвонаармейсквугаль». Званне Героя Сацыялістычнай Працы атрымаў у 1968 г., калі выдаў на-гара 36 000 т вугалю. Жыве ў Данбасе.

**БЯГАНСКІ Міхаіл Паўлавіч.** Нарадзіўся ў 1934 г. у в. Узгорск Слаўгарадскага раёна. З 1958 г. трактарыст Слаўгарадскай РТС, саўгаса «Жалезінскі», з 1959 г. у калгасе імя Кірава. З 1962 г. звеннявы па

вырошчванні бульбы, выдатнымі дасягненнямі ў гэтай справе праславіўся на ўсю краіну. У 1971 — 1975 гг. дэпутат Вярхоўнага Савета БССР. У 1973 г. М.П.Бяганскаму прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы. Працуе ў калгасе «Зарэчанскі».

**ЗЫМАЛЁЎ *Ягор Сямёнавіч.*** Нарадзіўся ў 1911 г. у в. Ляцягі Слаўгарадскага раёна. Скончыў горны і планава-эканамічны факультэты Маскоўскага горнага інстытута. Кандыдат тэхнічных навук. Працаваў горным інжынерам, начальнікам горнага ўчастка ў Крыварожжы. У час Айчыннай вайны — начальнік горнага ўчастка ва Усходнім Казахстане. Пасля вайны вярнуўся ў Крывы Рог, працаваў начальнікам шахты, старшынёй ЦК прафсаюза працоўных жалезаруднай прамысловасці Поўдня СССР, галоўным інжынерам, кіраўніком трэста «Дзяржжынвугаль». З 1967 г. — у Міністэрстве чорнай металургіі. Герой Сацыялістычнай Працы (1966). Памёр у 1987 г.

**ІСАЕНКА Іван Васільевіч.** Нарадзіўся ў 1922 г. у в. Прудок Слаўгарадскага раёна. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 1956 г. — памочнік майстра, майстар, старшы майстар, начальнік цэха, з 1978 г. — інжынер-тэхнолаг Рагачоўскага малочнага камбіната. За высокія паказчыкі ў вытворчасці мясных і малочных прадуктаў І.В.Ісаенку ў 1966 г. прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы.

**МАРУШЭНКА Васіль Цімафеевіч.** Нарадзіўся ў 1926 г. у в. Прудок Слаўгарадскага раёна. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 1950 г. працаваў у МТС, Быхаўскім будаўніча-мантажным упраўленні, з 1964 г. — трактарыст-машыніст калгаса «Зара». Званне Героя Сацыялістычнай Працы прысвоена ў 1975 г. У 1975 — 1980 гг. — дэпутат Вярхоўнага Савета БССР.

**СТАРАВОЙТАЎ Аляксандр Паўлавіч.** Нарадзіўся ў 1934 г. у в. Лебядзёўка Слаўгарадскага раёна ў беднай мнагадзетнай сям'і. З 1951 г. працаваў мулярам на будоўлях Магілёва, потым узначальваў комплексную брыгаду будаўнічага ўпраўлення № 59 будтрэста № 12. Герой Сацыялістычнай Працы (1971). Заслужаны будаўнік БССР (1965). Дэпутат Вярхоўнага Савета СССР у 1966 — 1970, 1977 — 1979 гг., дэпутат Вярхоўнага Савета БССР у 1971 — 1975, 1980 — 1985 гг. Жыве ў Магілёве.


Я.С.Зымалёў.


І.В.Ісаенка.


В.Ц.Марушэнка.


А.П.Старавойтаў.

* * *

**АГНЁЎ Анатоль Фёдаравіч.** Нарадзіўся ў 1937 г. у г. Мамадым, Татарстан. Пасля смерці бацькоў з 1947 г. па 1951 г. выхоўваўся ў дзетдоме. Пасля заканчэння ў 1955 г. Клімавіцкага саўгаса-тэхнікума два гады працаваў у Слаўгарадскай ветлячэбніцы. У 1957 — 1960 гг. служыў у Савецкай Арміі, потым працаваў загадчыкам Свенскага ветучастка, старшынёй калгаса «Савецкая Беларусь». З 1977 г. узначальваў свінакомплекс «Свенск». Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. Памёр 2.2.1994 г.

**АЛЯКСЕЕНКА Павел Барысавіч.** Нарадзіўся ў 1922 г. у в. Слаўня Слаўгарадскага раёна. У час акупацыі страціў нагу. Пасля вызвалення раёна скончыў курсы трактарыстаў і больш за 40 гадоў працаваў у калгасе «Зара». Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

**АНДРЭЕВА (БЯКЕШКА) Вера Пятроўна.** Нарадзілася ў 1920 г. у в. Зарэчча



М.І.Гарэлікаў.

Круглянскага раёна. У 1945 г. скончыла Мінскі медыцынскі інстытут і была прызначана галоўным урачом Целяшоўскай участковай бальніцы. Выбіралася дэпутатам абласнога і раённага Саветаў. Узнагароджана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, знакам «Выдатнік аховы здароўя». Жыве ў в. Целяшы Слаўгарадскага раёна.

**АНДРЭЕНКА Анатоль Раманавіч.** Нарадзіўся ў 1936 г. у в. Турышчава Горацкага раёна. Пасля заканчэння ў 1974 г. Беларускай сельгасакадэміі да 1984 г. працаваў старшынёй калгаса імя М.Горкага, потым старшынёй Васькавіцкага сельсавета. Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. Памёр у кастрычніку 1993 г.

**АНІШЧАНКА Васіль Піліпавіч.** Нарадзіўся ў в. Курганаўка Слаўгарадскага раёна. Трактарыст калгаса «Кастрычнік». Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга і медалём «За працоўную дзейнасць».

**АФАНАСЬЕВА Варвара Герасімаўна.** Нарадзілася ў 1924 г. у в. Ляцягі Слаўгарадскага раёна. З 16 гадоў працавала ў калгасе спачатку на палявых работах, потым даглядчыцай цялят і даяркай на ферме. За плённую працу ўзнагароджана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга (1973), медалём «За доблесную працу. У азнаменаванне 100-годдзя з дня нараджэння У.І.Леніна», Граматай Вярхоўнага Савета БССР.

**БАРАДАЦЕНКА Агаф'я Ціханаўна.** Нарадзілася ў 1937 г. у в. Завад-Віравая Слаўгарадскага раёна. З дзяцінства працавала ў калгасе, потым узначальвала завадвіраўскую паляводчую брыгаду. За дасягнутыя поспехі ў вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі ўзнагароджана ордэнам Леніна. Памерла ў 1985 г.

**БАТОЎКІН Аляксей Аляксандравіч.** Нарадзіўся ў 1932 г. у в. Кабіна Гара Слаўгарадскага раёна. Трактарыст-камбайнер калгаса «Кастрычнік». Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. Працуе ў калгасе слесарам.

**БАЦАНКОЎ Іван Ісакавіч.** Нарадзіўся ў 1923 г. у в. Пацяраеўка Слаўгарадскага раёна. Працаваў трактарыстам племсаўгаса «Жалезінскі». Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

**БОНДАРАЎ Аляксей Мацвеевіч.** Нарадзіўся ў 1928 г. у в. Устаннае Слаўгарадскага раёна. Працаваў трактарыстам у племсаўгасе «Жалезінскі». Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

**БУРАКОЎ Павел Мікалаевіч.** Нарадзіўся ў 1939 г. у в. Кабіна Гара Слаўгарадскага раёна. Трактарыст калгаса «Кастрычнік». Узнагароджаны залатым медалём ВДНГ, ордэнамі Працоўнай Славы III ступені, «Знак Пашаны». Працуе трактарыстам.

**ВАСІЛЬКОВА (МАРКУСЕНКА) Лідзія Яфрэмаўна.** Нарадзілася ў 1921 г. у в. Гайшын Слаўгарадскага раёна. Працавала даяркай у калгасе імя Леніна. У пасляваенны час першай у раёне ўзнагароджана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. Жыве ў Магілёве.

**ГАРАШЧУК Юлія Кананаўна.** Нарадзілася ў 1928 г. у в. Бахань Слаўгарадскага раёна. У 1945 г. скончыла школу ФЗН у Гомелі. Працавала тынкоўшчыцай у будаўнічых арганізацыях Гомеля, Рэчыцы, г. Кандалакша Мурманскай вобласці. З 1961 г. брыгадзір тынкоўшчыкаў Быхаўскай перасоўнай механізаванай калоны № 20. У 1967 г. Ю.К.Гарашчук выбіралася дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР. У 1968 г. ёй прысвоена званне «Заслужаны будаўнік БССР». Узнагароджана ордэнамі Леніна (1974), Працоўнага Чырвонага Сцяга, «Знак Пашаны». Жыве ў Быхаве.

**ГАРЭЛІКАЎ Мікалай Ігнатавіч.** Нарадзіўся ў 1917 г. у в. Ляцягі Слаўгарадскага раёна. З 1939 г. па 1944 г. у Чырвонай Арміі. Пасля цяжкага ранення дэмабілізаваўся, працаваў у калгасе трактарыстам. За выдатную працу ўзнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, Граматай Вярхоўнага Савета БССР. Памёр у 1993 г.

**ГАРЭЛІКАЎ Міхаіл Іванавіч.** Нарадзіўся ў 1924 г. у в. Устаннае Слаўгарад-

скага раёна. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, спачатку ў партызанскім палку «Трынаццаць», потым у Чырвонай Арміі. Пасля вайны трактарыст МТС, камбайнер калгаса. Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалём «За працоўную доблесць».

**ГРАДУСАВА Марыя Міхайлаўна.** Нарадзілася ў 1938 г. у в. Прудок Слаўгарадскага раёна. У 1956 г. пераехала ў Быхаўскі раён, працавала даяркай у саўгасе «Вараніно». У 1977 г. ёй прысвоена званне «Лепшая даярка калгаса». Выбіралася дэпутатам Быхаўскага раённага і Следзюкоўскага сельскага Саветаў народных дэпутатаў. Узнагароджана ордэнамі Леніна (1976), Працоўнага Чырвонага Сцяга. Жыве ў в. Вараніно Быхаўскага раёна.

**ГРАНШЧЫКАЎ Міхаіл Якаўлевіч.** Нарадзіўся ў 1927 г. У 1967 – 1985 гг. старшыня калгаса «Кастрычнік». Узнагароджаны двума ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга. Жыве ў Слаўгарадзе.

**ГРЫГОР'ЕЎ Васіль Касьянавіч.** Родам з в. Слаўня Слаўгарадскага раёна. У 1912 г. скончыў Рагачоўскую настаўніцкую семінарыю. Працаваў у Чарнякоўскай земскай школе, потым настаўнікам у сяле Назарава ў Заходне-Сібірскім краі. Узнагароджаны ордэнам Леніна (1945), медалём «За доблесную працу ў Вялікай Айчыннай вайне 1941 – 1945 гг.».

**ДАВЫДЗЕНКА Валянціна Уладзіміраўна.** Нарадзілася ў 1934 г. у в. Васькавічы Слаўгарадскага раёна. 26 гадоў працавала даяркай у калгасе імя М.Горкага. Узнагароджана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. Жыве ў Кобрынскім раёне Брэсцкай вобласці.

**ДЗЕНІСЕНКА Вольга Данілаўна.** Нарадзілася ў 1921 г. у в. Гайшын Слаўгарадскага раёна. Даярка калгаса імя М.Горкага. Узнагароджана ордэнамі Леніна і Працоўнага Чырвонага Сцяга.

**ДЗЯМІДАЎ Веньямін Аляксандравіч.** Нарадзіўся ў 1924 г. у в. Васільеўка Міжрэчанскага раёна Валагодскай вобласці. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, на фронце страціў нагу. Пасля дэмабілізацыі з Чырвонай Арміі працаваў у школе ваенруком, у райвыканкоме. У 1955 – 1978 гг. старшыня калгаса «Зара». Узнагароджаны ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны I ступені, Чырвонай Зоркі, Граматай Вярхоўнага Савета БССР. Памёр у 1986 г.



В.К.Грыгор'еў.



В.А.Дзямідаў.



М.Ф.Ефіменка.



Ф.П.Кавалёў.

**ЕРАШЭНКА Соф'я Захараўна.** Нарадзілася ў 1929 г. Працавала даяркай у калгасе імя М.Горкага. Узнагароджана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. Жыве ў в. Ганчароўка Слаўгарадскага раёна.

**ЕФІМЕНКА Марыя Філатаўна.** Нарадзілася ў 1919 г. ў в. Рабінаўка Слаўгарадскага раёна. Больш за 30 гадоў працавала ў жывёлагадоўлі. У 1966 г. узнагароджана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. Жыве ў в. Лапацічы Слаўгарадскага раёна.

**ЗАБЕНІНА Варвара Трафімаўна.** Нарадзілася ў 1912 г. у Слаўгарадзе. Адна са старэйшых даярак калгаса «Кастрычнік». Узнагароджана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. Неаднаразова выбіралася дэпутатам мясцовых Саветаў. Памерла ў 1993 г.

**ІВУЛЬЕЎ Пётр Аляксеевіч.** Нарадзіўся ў 1924 г. у Слаўгарадзе. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Пасля вайны

працаваў на хлебазаводзе, у ПМК будаўніком. У 1974 г. узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

**КАВАЛЁВА Марыя Аляксандраўна.** Нарадзілася ў 1934 г. Працавала даяркай у калгасе «Радзіма». Узнагароджана ордэнам Леніна. Жыве ў в. Ляцягі Слаўгарадскага раёна.

**КАВАЛЁВА (АНДРЭЕВА) Ніна Анісімаўна.** Нарадзілася ў 1926 г. у Слаўгарадзе. Восенню 1943 г. добраахвотна пайшла ў дзеючую армію, тэлефаністка 380-й стралковай дывізіі, вайну закончыла ў Берліне. Узнагароджана ордэнам Чырвонай Зоркі, медалём «За баявыя заслугі». Дзвюма ўрадавымі ўзнагародамі адзначана праца Н.А.Кавалёвай і ў пасляваенны час. Памерла ў 1982 г.

**КАВАЛЁЎ Фёдар Пятровіч.** Завочна скончыў Жыліцкі саўгас-тэхнікум. Брыгадзір комплекснай брыгады калгаса імя Куйбышава ў в. Дуброўка. Узнагароджаны ордэнамі Леніна і Працоўнага Чырвонага Сцяга. Жыве ў в. Свенск Слаўгарадскага раёна.

**КАЛЕНЧАНКА Пётр Іванавіч.** Нарадзіўся ў 1918 г. у Слаўгарадзе. Узначальваў кабінагорскую брыгаду калгаса «Кастрычнік». Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. Жыве ў в. Кабіна Гара Слаўгарадскага раёна.

**КАНТАНІСТАВА Ксенія Трафімаўна.** Нарадзілася ў 1920 г. у в. Рагі. Да Вялікай Айчыннай вайны працавала звеннявой паляводчай брыгады ў калгасе «Пралетарый» Слаўгарадскага раёна. З 1950 г. — даярка саўгаса «Вараніно» Быхаўскага раёна. У 1971 г. узнагароджана ордэнам Леніна. Жыве ў в. Вараніно Быхаўскага раёна.

**КАСЦЮЧЭНКА Эмілія Аляксееўна.** Нарадзілася ў 1926 г. у в. Рабавічы Слаўгарадскага раёна. З 1964 г. — брыгадзір жывёлагадоўчай фермы ў в. Рабавічы. Узнагароджана ордэнам Леніна (1966). Неаднаразова выбіралася дэпутатам мясцовага Савета. Жыве ў в. Рэкта.

**КАСЦЮЧЭНКА Юлія Фёдараўна.** Нарадзілася ў 1944 г. у Слаўгарадзе. У 1968 г. скончыла Уладзімірскі педінстытут. Працуе выкладчыцай англійскай мовы ў слаўгарадскай СШ № 2. Узнагароджана ордэнамі Кастрычніцкай Рэвалюцыі, «Знак Пашаны», знакам «Выдатнік народнай асветы БССР».

**КІРАЁНАК Мікалай Апанасавіч.** Нарадзіўся ў 1946 г. у в. Каменка. Трактарыст Сожскага спецаддзялення «Сельгастэхнікі». Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. Выехаў з раёна ў сувязі з забруджанасцю мясцовасці радыяцыяй.

**КРЫВАРУЦКАЯ Лізавета Пілінаўна.** Нарадзілася ў 1932 г. у в. Рабавічы Слаўгарадскага раёна. Даярка саўгаса «Лясная». Узнагароджана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга (1966).

**КУЗЬМЯНКОВА Валянціна Рыгораўна.** Нарадзілася ў 1923 г. у в. Устаннае Слаўгарадскага раёна. Працавала даяркай ў племсаўгасе «Жалезінскі». Узнагароджана ордэнамі Леніна, Працоўнага Чырвонага Сцяга, «Знак Пашаны». Памерла ў 1984 г.

**КУЗЬМЯНКОВА Вольга Пілі паўна.** Нарадзілася ў 1924 г. у в. Устаннае Слаўгарадскага раёна. Даярка племсаўгаса «Жалезінскі». Узнагароджана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

**КУЗЬМЯНКОВА Марыя Ануфрыеўна.** Нарадзілася ў в. Устаннае Слаўгарадскага раёна. Даярка племсаўгаса «Жалезінскі». Узнагароджана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. Выехала з раёна.

**ЛЯВОНАВА Ганна Пятроўна.** Нарадзілася ў 1923 г. у в. Лапацічы Слаўгарадскага раёна. Увесь час пасля вайны працавала даяркай у калгасе. Узнагароджана ордэнамі Леніна і Працоўнага Чырвонага Сцяга.

**ЛЯВОНЧЫКАЎ Васіль Анісімавіч.** Родам з в. Урэчча-2 Слаўгарадскага раёна. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Пасля вайны працаваў у калгасе «17 партз'езд» брыгадзірам, старшынёй. За працоўныя поспехі ўзнагароджаны ордэнам Кастрычніцкай Рэвалюцыі.

**МАРТЫНЕНКА Ева Макараўна.** Нарадзілася ў 1933 г. у в. Азарычы Слаўгарадскага раёна. Даярка племсаўгаса «Жалезінскі». Узнагароджана ордэнам Леніна.

**МАРУШЭНКА Уладзімір Фёдаравіч.** Нарадзіўся ў 1929 г., з сялян. Брыгадзір паляводчай брыгады калгаса «Зара». У 1979 г. узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. Памёр у 1990 г.

**МУРАНКОЎ Уладзімір Цітавіч.** Нарадзіўся ў 1921 г. у в. Шапялёўка Горацкага раёна. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. У пасляваенны час працаваў у раёне на розных пасадах, апошнія гады —

старшыня Слаўгарадскага райвыканкома. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны, Працоўнага Чырвонага Сцяга, «Знак Пашаны», многімі медалямі. Жыве ў Слаўгарадзе.

**МУШТУКОЎ Ананій Акімавіч.** Нарадзіўся ў 1894 г. у в. Машэцкая Слабада. З 1909 г. па 1915 г. працаваў у валасным праўленні ў в. Доўгі Мох, з 1915 г. служыў пісарам у вайсковага начальніка ў Быхаве, з 1917 г. служыў у Петраградзе. Удзельнік Кастрычніцкай рэвалюцыі. У лютым 1918 г. пасля дэмабілізацыі вярнуўся на радзіму ў в. Машэцкая Слабада, добраахвотна ўступіў у Слаўгарадзе ў валасны ваенны камісарыят і праводзіў мабілізацыю ў Чырвоную Армію. З 1923 г. працаваў у Быхаўскім райваенкамаце, з 1930 г. — у ваенкаматах Казані, Хоцімска, Быхава. З 1953 г. на пенсіі. Узнагароджаны ордэнамі Леніна (1949), Чырвонага Сцяга, Чырвонай Зоркі, медалямі. Памёр у 1974 г.

**НОВІКАВА Еўдакія Піліпаўна.** Нарадзілася ў 1922 г. у в. Рудня Васькавіцкага сельсавета Слаўгарадскага раёна. Працавала даяркай у калгасе імя М.Горкага. Узнагароджана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

**ПАБОРЦАЎ Карп Тарасавіч.** Нарадзіўся у 1903 г. у в. Старая Каменка Слаўгарадскага раёна. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны з першых дзён. Пасля вайны працаваў настаўнікам Каменкаўскай васьмігадовай школы. Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. Памёр 27.4.1980 г.

**ПАДСЫПАННІКАЎ Восіп Ігнатавіч.** Нарадзіўся ў 1931 г. у в. Дуброўка Слаўгарадскага раёна. Працаваў паляводам у калгасе імя Куйбышава, з 1963 г. — механізатарам у калгасе «Савецкая Беларусь». Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга (1973). Мае знак «Выдатнік сацыялістычнай сельскай гаспадаркі». Жыве ў в. Ржаўка-2 Слаўгарадскага раёна.

**ПРЫВАЛАВА Лукер'я Аксёнаўна.** Нарадзілася ў 1883 г. у в. Дабранка Слаўгарадскага раёна. Працавала на ферме ў калгасе «Памяць Фрунзе». Адной з першых у раёне ўзнагароджана ордэнам Леніна (1937). Выбіралася дэпутатам мясцовых Саветаў. Памерла ў 1969 г.

**РАДЧАНКА Цярэнцій Цярэнцьевіч.** Нарадзіўся ў 1933 г. у в. Рагі. Працаваў



Ц.Ц.Радчанка.



І.Я.Сувораў.

механізатарам у калгасах «Пралетарый», імя Леніна. У 1967 г. абраны дэпутатам Вярхоўнага Савета СССР. Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалямі. Жыве ў г. Паставы Віцебскай вобл. Працуе на малым прадпрыемстве. Заслужаны механізатар БССР.

**САМУСЁЎ Цімафей Барысавіч.** Нарадзіўся ў 1922 г. у в. Лапацічы Слаўгарадскага раёна. Трактарыст племсаўгаса «Жалезінскі». Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

**САМУСЕНКА Аляксей Якаўлевіч.** Нарадзіўся ў 1918 г. у в. Рудня Васькавіцкага сельсавета Слаўгарадскага раёна. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. У пасляваенны час працаваў брыгадзірам, намеснікам старшыні калгаса «Кастрычнік». Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны, Кастрычніцкай Рэвалюцыі, медалямі «За доблесную працу», «Ветэран працы», бронзавым медалём ВДНГ. Памёр у 1984 г.

**САМУСЕНКА Панкрат Сідаравіч.** Нарадзіўся ў в. Рудня Васькавіцкага сельсавета Слаўгарадскага раёна. Працаваў настаўнікам Міхайлоўскай няпоўнай СШ, у пасляваенныя гады — у школе № 20 г. Кіева. Узнагароджаны ордэнам Леніна. Заслужаны настаўнік Украінскай ССР. Памёр у 1958 г.

**СТАРАСЦЕНКА Іван Уладзіміравіч.** Нарадзіўся ў 1942 г. у в. Зарэчча Васькавіцкага сельсавета Слаўгарадскага раёна. Працаваў трактарыстам у калгасе імя М.Горкага. Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. Памёр у 1975 г.

**СУВОРАЎ Іван Якаўлевіч.** Нарадзіўся у 1908 г. у г. Юхнаў Калужскай

вобласці. У Чырвонай Арміі з 1930 г. па 1956 г., удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Айчыннай вайны I ступені, двума ордэнамі Чырвонай Зоркі, медалямі. Маёр у адстаўцы. У пасляваенны час працаваў у Слаўгарадскім райваенкамаце. Памёр у 1987 г. Пахаваны ў Слаўгарадзе.

**СЦЯПАНАЎ Мікалай Лукіч.** Нарадзіўся ў 1929 г. ў в. Любаны Слаўгарадскага раёна. Пасля заканчэння ў 1952 г. Беларускай сельгасакадэміі працаваў у сельскай гаспадарцы, з 1957 г. — дырэктар саўгаса «Жалезінскі». Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга і медалём «За працоўную доблесць». Памёр у 1989 г.

**ТАЧЫЛАЎ Міхаіл Панфілавіч.** Нарадзіўся у 1921 г. у в. Ржаўка. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Скончыў Магілёўскую школу сельскагаспадарчых кіруючых кадраў. Працаваў аграномам, брыгадзірам у калгасе «Савецкая Беларусь». Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга (1972), медалямі. Двойчы ўдзельнік ВДНГ.

**ЦАРАНКОВА Марыя Адамаўна.** Нарадзілася ў 1919 г. у в. Трасліўка. У калгасе працавала з 1938 г. у паляводстве і жывёлагадоўлі. Узнагароджана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга (1971), медалямі «За доблесную працу. У азнаменаванне 100-годдзя з дня нараджэння У.І.Леніна», «Ветэран працы». Мае званне «Заслужаны калгаснік». Жыве ў калгасе «40 гадоў Кастрычніка».

**ЧАРТКОЎ Кірыла Паўлавіч.** Пра К.П.Чарткова можна без перабольшання сказаць, што ён абаронца і вызваліцель сталіц. У 1941 г., калі Радзіма загадала «Ні кроку назад!», Чарткоў мужна абараняў Маскву. У 1944 г. вызваляў свой абласны цэнтр г. Магілёў, сталіцу Беларусі г. Мінск, у пачатку 1945 г. прымаў удзел у вызваленні Варшавы, а праз некалькі месяцаў штурмаваў Берлін. Ордэнамі Айчыннай вайны I і II ступеней, двума ордэнамі Чырвонай Зоркі, медалём «За баявыя заслугі» адзначыла Радзіма мужнасць і адвагу сялянскага хлопца з в. Ржаўка.

Пасля заканчэння вайны К.П.Чарткоў вярнуўся на Слаўгарадчыну. Былы воін лічыў за гонар зрабіць усё магчымае, каб хутчэй аднавіць родныя мясціны, разбураную гаспадарку. Ён працаваў дырэктарам Жалезінскай МТС, потым страшынёй кал-



К.П.Чарткоў у час сустрэчы са школьнікамі.

гаса. Калекцыя яго ранейшых узнагарод папоўнілася адзнакай за ўзорную працу — ордэнам «Знак Пашаны».

*В.М.Паддубны.*

**ЧАСНАКОЎ Аляксей Васільевіч.** Нарадзіўся ў 1917 г. у в. Курганаўка Слаўгарадскага раёна. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Адзін са старэйшых механізатараў калгаса «Кастрычнік». Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Айчыннай вайны, медалямі. Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі.

**ШУБАДЗЁРАЎ Мікіта Захаравіч.** Нарадзіўся ў 1926 г. у в. Лебядзёўка. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. У пасляваенны час працаваў у калгасе «Зара». Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны, Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалямі. Памёр у 1988 г.

**ЯКАВЕНКА Лідзія Фёдараўна.** Нарадзілася ў 1927 г. у в. Васькавічы ў беднай мнагадзетнай сям'і. З юнацкіх гадоў і да апошніх дзён свайго жыцця працавала ў калгасе імя М.Горкага. Узнагароджана ордэнамі Леніна і Працоўнага Чырвонага Сцяга. Памерла ў 1977 г.

**ЯЎСЕЕНКА Мікалай Мікалаевіч.** Нарадзіўся ў 1929 г. у Слаўгарадзе. Трактарыст-камбайнер калгаса «Кастрычнік». Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. Памёр у 1992 г.

## ЗАСЛУЖАНЫЯ РАБОТНІКІ

**АРОЛ Надзея Апанасаўна.** Нарадзілася ў 1898 г. у в. Малы Булык Адэскай вобласці. Мела сярэднюю педагагічную адукацыю. На педрабоце з 1912 г., з 1925 г. працавала настаўніцай пачатковых класаў у Слаўгарадскім раёне. За шматгадовую і плённую працу ёй першай у раёне прысвоена ганаровае званне «Заслужаны настаўнік БССР» (1957). Памерла ў 1978 г.

**АБРАМОВІЧ Ала Аляксандраўна.** Нарадзілася ў 1926 г. у в. Сяліба Быхаўскага раёна. У 1946 г. скончыла настаўніцкі інстытут, у 1959 г. — геаграфічны факультэт Магілёўскага педінстытута. Працавала настаўніцай геаграфіі, інспектарам Слаўгарадскага райана. У 1966 — 1986 гг. — намеснік дырэктара слаўгарадскай СШ №1. Кіраўнік метадычнага аб'яднання настаўнікаў геаграфіі школ раёна. Педагагічная дзейнасць А.А.Абрамовіч адзначана ордэнам «Знак Пашаны», медалём «За доблесную працу. У азнаменаванне 100-годдзя з дня нараджэння У.І.Леніна», знакам «Выдатнік народнай асветы», Ганаровай граматай ЦК ВЛКСМ. У 1966 г. ёй прысвоена званне «Заслужаны настаўнік». Пенсіянерка. Працуе ў слаўгарадскай СШ № 1.



А.А.Абрамовіч.



А.П.Берднікава.

**БАДЗЕЕВА Ганна Аксёнаўна.** Нарадзілася ў 1922 г. у в. Бязуевічы Слаўгарадскага раёна. На працягу 44 гадоў працавала ў калгасе імя У.І.Леніна. Мае званне «Заслужаны калгаснік».

**БЕРДНІКАВА Антаніна Паўлаўна.** Нарадзілася ў 1930 г. у в. Лебядзёўка ў беднай мнагадзетнай сям'і. У 1951 г. скончыла Крычаўскае педвучылішча. Працавала настаўніцай у Рылаўскай пачатковай школе Лідскага раёна Гродзенскай вобласці, у 1955 — 1988 гг. — у школах Слаўгарадскага раёна. Узнагароджана медалём «За доблесную працу». У 1972 г. А.П.Берднікавай прысвоена званне «Заслужаны настаўнік БССР».

**БУБНОЎ Кірыла Васільевіч.** Нарадзіўся ў 1900 г. у в. Бахань Слаўгарадскага раёна. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Мае званне «Заслужаны калгаснік». Памёр у 1970 г.

**БУБНОЎ Павел Ніканoравіч.** Нарадзіўся у 1910 г. у в. Бахань Слаўгарадскага раёна. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Мае званне «Заслужаны калгаснік». Памёр у 1983 г.

**ГОЕВА Вольга Гаўрылаўна.** Нарадзілася ў 1918 г. У 1936 г. скончыла Крычаўскае педвучылішча. Працавала настаўніцай у Жалезінскай пачатковай школе, у 1954 — 1974 гг. — у пачатковых класах слаўгарадскай СШ № 1. Ганаровае званне «Заслужаны настаўнік БССР» прысвоена ў 1968 г. Памерла ў 1981 г.



П.І.Лагуцёнак.

**ГУБАРЭВІЧ Апалінарый Вільгельмавіч.** Нарадзіўся ў 1918 г. у г. Багушэўск Віцебскай вобласці. У 1941 г. скончыў Віцебскі ветэрынарны інстытут. З 1951 г. працаваў у Слаўгарадскім раёне ветурачом, галоўным ветурачом, загадчыкам ветлабараторыі. Мае званне «Заслужаны ветэрынарны ўрач БССР». Выехаў з раёна ў сувязі з радыяцыяй.

**ЕЎДАКІМАЎ Мікалай Пятровіч.** Нарадзіўся ў 1919 г. У 1948 г. скончыў Віцебскі ветэрынарны інстытут. З 1951 г. працаваў у Слаўгарадскай райветлячэбніцы ветурачом, галоўным ветурачом. Званне «Заслужаны ветэрынарны ўрач БССР» прысвоена ў 1967 г. Памёр у 1991 г.

**ЖУКАВА Васіліса Фядосаўна.** З першых пасляваенных гадоў і да канца свайго жыцця працавала даяркай калгаса «Савецкая Беларусь». У 1963 г. ёй прысвоена званне «Заслужаны калгаснік».

**ЖУКАЎ Емяльян Лаўрэнавіч.** Нарадзіўся ў 1894 г. у в. Бахань Слаўгарадскага раёна. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Мае званне «Заслужаны калгаснік». Памёр у 1966 г.

**КАВАЛЁЎ Іван Канстанцінавіч.** Нарадзіўся ў 1919 у в. Шаламы. Скончыў Магілёўскі педінстытут (1964). Педагагічную дзейнасць пачаў у 1936 г., працаваў выхавацелем дзіцячых устаноў, дырэктарам дзіцячага дома ў Слаўгарадзе. У 1936—1946 гг. —у Чырвонай Арміі. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны і вайны з Японіяй. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі і медалямі. Званне «Заслужаны настаўнік БССР» І.К.Кавалёву прысвоена ў 1970 г. Памёр у 1977 г.

**КАВАЛЁЎ Нічыпар Мікітавіч.** Нарадзіўся ў 1907 г. У 1924 г. скончыў Магілёўскую фельчарска-акушэрскую школу, потым медыцынскі інстытут. З 1931 г. працаваў загадчыкам Ляснянскай участковай бальніцы. У Вялікую Айчынную вайну — вядучы хірург санітарнага батальёна 6-й арміі. Пасля вайны працаваў урачом, галоўным урачом Слаўгарадскай бальніцы. Званне «Заслужаны ўрач БССР» прысвоена ў 1948 г. Памёр.

**КАЛІНІЧЭНКА Пётр Фёдаравіч.** Нарадзіўся ў 1938 г. у в. Юр'еўка Днепрапятроўскай вобласці. З 1973 г. працаваў на адкорме жывёлы ў калгасе імя М.Горкага. Дэлегат 4-га з'езда калгаснікаў СССР. Узнагароджаны Граматай Вярхоўнага Савета БССР, дыпломам ВДНГ. Мае званне «Заслужаны калгаснік».

**КЛІМАЎ Аляксандр Трафімавіч.** Нарадзіўся ў 1938 г. у в. Добры Дуб Слаўгарадскага раёна. Механізатар калгаса імя Суворава. Удзельнік ВДНГ. Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны». Мае званне «Заслужаны калгаснік». Выехаў у сувязі з радыяцыяй у Дрыбінскі раён.

**КРАСНАБАЕЎ Мікалай Іванавіч.** Нарадзіўся ў 1918 г. у в. Улукі Слаўгарадскага раёна. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Пасля вайны працаваў шафёрам у Жалезінскай МТС, у сельгастэхніцы, на аўтабазе № 21. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны І ступені, медалём «За баявыя заслугі». У 1975 г. М.І.Краснабаеву прысвоена ганаровае званне «Заслужаны работнік транспарту БССР».

**ЛАГУЦЁНАК Пётр Іванавіч.** У 1938 г. прызваны ў Чырвоную Армію. У час савецка-фінляндскай вайны (1939—1940) ваяваў у складзе 31-й лёгкай танкавай брыгады. У Вялікую Айчынную вайну быў дэсантнікам. Пад г. Чаркасы быў паранены, памылкова залічаны да мёртвых і цудам выратаваны байцом В.А.Глухоўскім ад пахавання ў брацкай магіле. Заслужаны донар СССР.

**ЛАЗАРЭНКА Марыя Іванаўна.** Нарадзілася ў 1931 г. у в. Цёплае Чавускага раёна. У 1957 г. скончыла фізіка-матэматычны факультэт Магілёўскага педінстытута. Працавала настаўніцай, у 1979—1985 гг. — дырэктарам Старынскай СШ. Узнагароджана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР, знакам «Выдатнік народнай адукацыі». У 1975 г. прысвоена ганаровае званне «Заслужаны настаўнік БССР».

**ЛАХТЫЧКІНА Марыя Ільінічна.** Нарадзілася ў 1938 г. Скончыла Мінскі кааператыўны тэхнікум. З 1962 г. працуе загадчыцай магазіна «Кнігі» ў Слаўгарадзе. У 1977 г. М.І.Лахтычкінай прысвоена ганаровае званне «Заслужаны работнік гандлю і грамадскага харчавання БССР».

**ЛУФЕРАЎ Антон Рыгоравіч.** Нарадзіўся ў 1897 г. у Слаўгарадзе. Больш за 35 гадоў працаваў чабаном у калгасе «Кастрычнік». Узнагароджаны медалём «За працоўную доблесць». Мае званне «Заслужаны калгаснік». Памёр.

**МЕЛЬНІКАВА Зоя Ягораўна.** Нарадзілася ў 1931 г. у в. Шаламы. У 1963 скончыла Магілёўскі педінстытут. З 1953 г. працуе настаўніцай і намеснікам дырэктара па вучэбна-выхаваўчай рабоце ў Васькавіцкай СШ. Узнагароджана ордэнам «Знак Пашаны». У 1971 г. З.Я.Мельнікавай прысвоена ганаровае званне «Заслужаны настаўнік БССР».

**МІНЧАНКА Раман Сямёнавіч.** Нарадзіўся ў 1916 г. у в. Васількі Бялыніцкага раёна. Скончыў Магілёўскі педінстытут. На педагагічнай працы з 1937 г. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны II ступені, медалямі, Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР. Заслужаны настаўнік БССР (1967). Мае знак «Выдатнік народнай асветы». З 1977 г. на пенсіі. Памёр у 1989 г. Пахаваны ў Слаўгарадзе.

**ПЕТРАЧКОЎ Мікіта Паўлавіч.** Нарадзіўся 20.4.1918 г. у в. Хоцішча Слаўгарадскага раёна. Скончыў Магілёўскі педінстытут (1938), курсы чырвоных камандзіраў пры Мінскім пяхотным вучылішчы (1939). З 26.6.1941 г. на Паўночна-Заходнім, з ліпеня 1942 г. на Ленінградскім франтах, старшы лейтэнант, камандзір стралковай роты. Летам 1944 г. пасля цяжкага ранення звольнены ў запас. Працаваў загадчыкам аддзела народай асветы ў Слаўгарадзе. З мая 1947 г. дырэктар Саскаліпскай сямігодкі, адначасова сакратар партарганізацыі Квачоўскага сельсавета Нясвіжскага раёна. Вёў выхаваўчую работу сярод мясцовага насельніцтва, удзельнічаў у правядзенні калектывізацыі сельскай гаспадаркі. Забіты бандытамі. Пахаваны ў г. Нясвіж. Імем М.П.Петрачкова названа вуліца ў в. Саска-Ліпка Нясвіжскага раёна.


Р.С.Мінчанка.


В.Р.Цішчанка.

**САМАДЗЕЛАВА Валянціна Мікітаўна.** Нарадзілася ў 1930 г. у Слаўгарадзе. З 1948 г. паштальён Слаўгарадскага вузла сувязі. У 1976 г. удастоена ганаровага звання «Заслужаны сувязіст БССР». Неаднаразова выбіралася дэпутатам Слаўгарадскага гарсавета.

**САМУСЕНКА Сяргей Якаўлевіч.** Нарадзіўся ў 1901 г. у в. Васькавічы. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Узнагароджаны медалямі «За баявыя заслугі», «За абарону Масквы» і іншымі. Яму прысвоена званне «Заслужаны калгаснік».

**ЦІТОВА Ганна Арсеньеўна.** Нарадзілася ў 1919 г. у в. Бронніца Буда-Кашалёўскага раёна. Скончыла Гомельскі педінстытут імя В.П.Чкалава. У 1944—1956 гг. працавала настаўніцай у школах Гомельскай, Гродзенскай і Віцебскай абласцей. У 1957—1975 гг. выкладала хімію ў Кульшыцкай СШ. Ганаровае званне «Заслужаны настаўнік БССР» прысвоена ў 1968 г.

**ЦІШЧАНКА Васіль Рыгоравіч.** Нарадзіўся ў 1918 г. у в. Улукі Слаўгарадскага раёна. У 1941 г. скончыў Мінскі мед-інстытут. Кандыдат медыцынскіх навук. З першых дзён Айчыннай вайны на фронце, начальнік шпіталя авіячасці. Палкоўнік медслужбы ў адстаўцы. Ганаровае званне «Заслужаны ўрач БССР» прысвоена ў 1961 г. Жыве ў Мінску.

**ЯЎСЕЕНКА Марыя Яўхімаўна.** Нарадзілася ў 1932 г. у в. Цёплае Чавускага раёна. Скончыла Магілёўскі педінстытут (1959). З 1952 г. на педагагічнай працы ў раёне: настаўніца Чарнякоўскай васьмігадовай, потым пачатковай школы, загадчыца навучальнай часткі Свенскай СШ. Ганаровае званне «Заслужаны настаўнік БССР» прысвоена ў 1973 г.

## Дзецьмі ганарылася па праву

«Дай бог дзяцей і ў дзецях толк». Зараз гэту прымаўку ўжо і не пачуеш. Але ж яшчэ зусім нядаўна яна ўжывалася вельмі часта. На жаль, не кожнай маці ў гэтым сэнсе шанцуе. А вось Софіі Сямёнаўне Старавойтавай пашанцавала. Ды яшчэ як!

Дзевяцярых дзяцей яна нарадзіла і выхавала. І кожны з іх стаў для маці ў



С.С.Старавойтава.

радасць. Кожным яна ганарылася па праву. Памятаецца, як у 1973 г. у час нашай сустрэчы з гэтай сям'ёй у вёсцы Лебядзёўка Софія Сямёнаўна распавядала аб сваім жыцці-быцці, аб дзецях. Вось сын Аляксандр Герой Сацыялістычнай Працы, былы дэпутат Вярхоўных Саветаў СССР і БССР шэрагу скліканняў, вядомы на ўсей Магілёўшчыне будаўнік.

А дачка Антаніна — заслужаная настаўніца БССР, узнагароджана медалём «За доблесную працу». Усёй Слаўгарадчыне вядомы і імёны яшчэ трох педагогаў з гэтай сям'і — Марыі, Валянціны і Кацярыны. А старшую хірургічную сястру Слаўгарадскай гарадской бальніцы Аляксандру Паўлаўну Старавойтаву не ведае хіба толькі той, хто ніколі не быў у раёне. Яна таксама адзначана медалём «За доблесную працу. У азнаменаванне 100-годдзя з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча Леніна».

Знайшлі сваё месца ў жыцці і сыны Васілій, Віктар і Фёдар — афіцэр, інжынер, юрыст.

Дык як жа было не ганарыцца імі Софіі Сямёнаўне і Паўлу Іўкавічу Старавойтавым.

*В.П.Ерашэнка.*

## Родам са Слаўгарадчыны

Шчодрая слаўгарадская зямля багатая на таленавітых і працавітых людзей. Сярод іх ёсць абаронцы Айчыны, вучоныя, дзяржаўныя дзеячы, паэты, кампазітары, артысты, мастакі, адным словам, прадстаўнікі розных прафесій.

Сваёй плённай дзейнасцю ў розных галінах народнай гаспадаркі, навукі, культуры яны памнажаюць багацце і славу роднай зямлі, уносяць важкі ўклад у справу развіцця матэрыяльнай і духоўнай культуры свайго народа.

### ВАЙСКОЎЦЫ

**БЯЛЯЕЎ Адам Юр'евіч.** Палкоўнік, камандзір танкавага палка. Нарадзіўся ў канцы XIX ст. у в. Васькавічы ў беднай сялянскай сям'і. Пасля ўстанаўлення на Слаўгарадчыне савецкай улады пайшоў у Чырвоную Армію. Пачынаў службу ў кавалерыі, потым перавучваўся на танкіста. Гітлераўскіх захопнікаў сустрэў на заходняй граніцы. З баямі выходзіў з акружэння. У 1943—1944 гг. удзельнічаў у вызваленні Беларусі. У гэты час ён ужо быў камандзірам танкавага палка. Узнагароджаны баявымі ордэнамі і медалямі. Пасля звальнення ў запас А.Ю.Бяляеў жыў у г. Мінеральныя Воды Стаўрапольскага краю, дзе і памёр.

**ВАШЧЫЛА Іван Іванавіч.** Палкоўнік, начальнік штаба дывізіі ўнутраных войскаў. Нарадзіўся ў 1921 г. у в. Папоўка ў беднай і мнагадзетнай сям'і. Рос і выхоўваўся ў матчынай сястры Варвары і яе мужа Антона Пятровіча Аксёненкі. Юнака, як і большасць яго равеснікаў, прываблівала прафесія абаронца Радзімы, і ён стаў ім. Прайшоў усю Вялікую Айчынную вайну. Баявая мужнасць І.І.Вашчылы адзначана ордэнамі Айчыннай вайны II ступені, «За службу Радзіме ва Узброеных Сілах СССР» III ступені, нагрудным знакам МООП, медалямі. У 1978 г.